©ПГУ

# МОГІЛКІ Ў ПАХАВАЛЬНА-ПАМІНАЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ КАНЦА XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

***І. В. АЗЕВІЧ,* У. А. ЛОБАЧ**

In the article the author considers the role of graves in the funeral customs of the Belarusians. We can conclude that the graves have been always the main place of memory of deads and organizing of symbolic actions. These actions have directed on search for support in daily rutine work

Ключавыя словы: могілкі, нябожчык, пахаванне, культ продкаў

У традыцыйным уяўленні могілкі – гэта месца вечнага спачыну памерлых. Сярод іншых назваў клады, пагосты [1, с. 172]. У нашых продкаў-язычнікаў месцамі пахавання былі лясы і гаі, а з увядзеннем на ўсходнеславянскіх землях хрысціянства месцы для пахавання вызначала царква: знатных людзей хавалі ў цэрквах, а простых людзей – пры цэрквах [2, с. 68]. Могілкі – месца пахавання родных памерлых у традыцыйным светапоглядзе ўсведамляецца як паселішча нябожчыкаў, супрацьпастаўленае паселішчу жывых. Цікава, што ў загадках могілкі закадаваныя менавіта як вёска, з адваротным, супрацьпастаўленым свету жывых – «Сяло заселена, петухі не пяюць і людзі не ўстаюць». Пры гэтым, як і вёска, могілкі маюць сваю ўласную структуру: межы (агароджа, роў), цэнтр (старыя магілы), перыферыю (пахаванні апошніх гадоў), «сялібы» (могілкі) і ўласна «жыхароў» (нябожчыкаў) [3, с. 73].

З могілкамі ў фальклоры да гэтага часу звязана вялікая колькасць прымхаў і павер'яў: цераз іх не пажадана хадзіць ноччу, на тэрыторыі могілак нельга збіраць ягады, капаць у начны час, забараняецца гучна смяяцца, гучна размаўляць, бо за ўсё гэта мёртвыя могуць адпомсціць жывым [1, с. 173]. Паводле ўяўленняў беларуса, нябожчыкі цешацца непарушным спакоем; ён кажа – «толькі на том свеце і можна спачыць». Парушаць спакой памерлых беларус лічыць недапушчальным, тым больш што і самі мерцвякі помсцяць за гэта; асабліва беларус баіцца ўзяць што-небудзь з могілак, не кажучы ўжо пра рэчы, якія належаць асабіста нябожчыку [4, с. 288]. Аднак негледзячы на гэта, асаблівай увагі заслугоўвае рытуальная практыка выкарыстання ў лекавых мэтах пяску з магіл вясковых знахараў, што з'яўляецца спецыфікай традыцыйнай культуры рэгёна Падзвіння [3, с. 80].

У адпаведнасці з традыцыйнымі ўяўленнямі ўраджай, пладавітасць у жывёлы і іншыя багацці трапляюць у свет людзей з іншасвету. Усё гэта – дар продкаў, які патрабуе нешта ўзамен [5, с. 119]. Таму жывыя, паводле народных уяўленняў, абавязаны прыходзіць да мёртвых, прыбіраць магілы, упрыгожваць іх, прыносіць рытуальныя пачастункі, дзяліцца навінамі. Лічылася, што гэта неабходна рабіць на Дзяды і Радаўніцу, святы памерлых, і таксама на гадавыя рэлігійныя святы: Вялікдзень, Тройцу [1, с. 172].

Такім чынам, могілкі былі месцам вечнага спачыну памерлых продкаў і адпраўлення сімвалічных дзеянняў, накіраваных на залагоджванне сваіх «дзядоў».

## Літаратура

1. *Ненадавец, А.М. Могілкі.* Беларускі фальклор: энцыклапед. У 2 т. Т 2. Лабараторыя традыцыйнага мастацтва. / Рэдкал: Г.Л. Пашкоў і інш. Мн.: БелЭн, 2006 . – с. 172–173.
2. *Сысоў, У.* Беларуская пахавальная абраднасць. – Мн.: Навука і тэхніка, 1995. – 182 с.
3. *Лобач, У.А.* Сімвалічны статус і рытуальныя функцыі могілак у беларускай народнай культуры вярхоўяў Бярэзіны і Віліі XX – пачатку XXI ст. / У.А. Лобач // Вестник ПГУ. Сер. Гуманитарные науки. – 2008. - №1. – С. 71–82
4. *Васілевіч, У. Л.* Жыцця адвечны лад: Беларускія народныя прыкметы і павер'я. – Мн.: Маст. літ., 1998. – 607 с.
5. *Байбурин, А.К.* Ритуал в традиционной культуре. Структурно-семантический анализ восточнославянских обрядов. – СПб.: «Наука», 1993. – 223 с.

©БГУКИ

# СПЕЦИФИКА РАБОТЫ РЕЖИССЕРА В ЛЮБИТЕЛЬСКОМ ТЕАТРЕ

***Я. И. АЛЕКСЕЕНКО*, З. М. ПАСЮТИНА**

On the base of a practical work and a stage experience at the theatre «On a Balcony» and at the theater-studio «The 7 Floor», there is a system represented at this science work and combination an educational program and principles of producer's work in arrangement of performance at the non-professional theatre. The program combinates a bit of traditional character with originality and novelty. Dialectical rising of different themes helps us to see the same things in various aspects. There are different forms of education, common principles and particular methods used at this program: synchronization of studding an actor's skills and producing, connection theory and practice knowledge, composing individual and group form of studies. A method of act analysis of a play and role and a method of physical actions, connected with a problem of searching a way of actor being are the science and methodology core of this program

Ключевые слова: любительский театр, методика преподавания, методика работы над спектаклем, репертуар, принципы жизнедеятельности театра